ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ**

# ЗАГАД

18.09.2024 № 636

г. Гомель

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**

# ПРИКАЗ

г. Гомель

Аб выніках абласнога этапу
Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу
"Нашчадкі традыцый"

У адпаведнасці з загадам начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама ад 20.03.2024 № 210, у мэтах патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэння рэгіянальных народных традыцый і развіцця даследчай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва ў сакавіку-верасні 2024 года адбыўся абласны этап IV Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу даследчых праектаў навучэнцаў "Нашчадкі традыцый" (далей – Фестываль-конкурс).

На Фестываль-конкурс быў прадстаўлены 21 даследчы праект навучэнцаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Большасць прадстаўленых конкурсных матэрыялаў адпавядалі патрабаванням умоў конкурсу, але ў шэрагу работ не прасочваецца самастойнасць даследавання навучэнцаў (пераважае апісанне педагагічнага вопыту і дзейнасці), адсутнічае апісанне працэсу і зместу практычнай работы, парушаны патрабаванні афармлення тэксту і дрэнная якасць відэаматэрыяла.

Не прынялі ўдзел у Фестывале-конкурсе навучэнцы ўстаноў адукацыі Нараўлянскага, Добрушскага, Акцябрскага, Петрыкаўскага і Рэчыцкага раёнаў.

На падставе вышэйвыкладзенага і рашэння журы
ЗАГАДВАЮ:

1. Прызнаць пераможцамі і прызёрамі Фестывалю-конкурсу і ўзнагародзіць дыпломамі галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама наступных навучэнцаў:

1.1. у намінацыі «Музычная спадчына маёй Радзімы»:

011041

III ступені – Букас Надзею, Курлянскую Аляксандру, навучэнцаў дзяржаўнай установы адукацыі (далей – ДУА) «Сярэдняя школа №11 г.Светлогорска» (кіраўнік Вішнеўская Л.Р.);

1.2. у намінацыі «Рукатворныя помнікі народнага мастацтва маёй краіны»:

I ступені – Кабаеву Кацярыну, Жыліцкую Соф'ю, Рагавога Максіма, Камарову Дар'ю, Жарына Кірыла, навучэнцаў народнай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Чараўніцы» ДУА «Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна» (кіраўнікі Крыкун С.В., Чуяшова А.Ф., Жарына Л.М.);

Малец Дар'ю, Фамічову Маргарыту, Падалінскую Віталіну, Клімцаву Варвару, Саўчанку Лізавету, навучэнцаў аб'яднанняў па інтарэсах «Народная лялька», «Залатая саломка», «Шыць модна», «Юны мадэльер» ДУА «Мазырскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі» (кіраўнікі Прыходзька І.В., Саратокіна С.У., Брагіна М.Л., Кузьменка К.П., Гімбут Л.Д.);

II ступені – Суханаву Аніту, Леўшунову Аляксандру, Булынку Валерыю, Суглоб Дар'ю, навучэнцаў аб'яднанняў па інтарэсах «Бісерапляценне», «Бу-Магія» ДУА «Веткаўскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі» (кіраўнікі Расафонава І.П., Кісель М.В.);

Пазняк Кацярыну, Арцёменка Арыну, Кавіцкую Паліну, Лагун Вераніку, навучэнцаў узорнай студыі выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Кудесница» ДУА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Цэнтральнага раёна г.Гомеля» (кіраўнікі Парошына Л.М., Піпчанкова С.В., Васільева Н.М., Арцеменка Т.У.);

III ступені – Крупнік Вікторыю, Мішкевіч Таццяну, навучэнцаў аб'яднання па інтарэсах «Залатая саломка» ДУА «Лельчыцкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі» (кіраўнікі Крупнік А.М., Ханчыч А.Р.);

1.3. у намінацыі « Культурныя традыцыі і абрады роднага краю»:

II ступені – Трошка Таццяну, Карнеявец Ксенію, Лышчанка Ксенію, Бондар Крысціну, навучэнцаў аб'яднання па інтарэсах «Рукодельница» ДУА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.Калінкавічы» (кіраўнікі Сідарава Н.В., Лежына Т.А.);

Сахараву Яўгенію, навучэнку ДУА «Сярэдняя школа №3 г.Жыткавічы імя І.М.Банава» (кіраўнік Сахарава Ю.С.);

III ступені – Рагавенка Максіма, навучэнца аб'яднання па інтарэсах «Святло Душы» ДУА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Гомельскага раёна» (кіраўнік Каралёва Н.А.).

2. Кіраўнікам аддзелаў адукацыі Добрушскага (Лапіцкая В.П.), Нараўлянскага (Кірганава А.І.), Акцябрскага (Фясько С.У.), Петрыкаўскага (Жукавец Л.М.), Рэчыцкага (Лукінская С.В.)

райвыканкамаў актывізаваць удзел навучэнцаў устаноў адукацыі ў Фестывалі-конкурсе.

3. Кіраўнікам аддзелаў адукацыі, спорту і турызму (адукацыі) райвыканкамаў, адміністрацый раёнаў г.Гомеля, упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама:

3.1. адшукаць магчымасць заахвочвання педагогаў, якія падрыхтавалі пераможцаў і прызёраў Фестывалю-конкурсу, указаных у пункце 1 загаду;

3.2. забяспечыць няўхільнае выкананне патрабаванняў па рэдактуры, афармленні тэкставых работ і відэаматэрыялаў, якія накіроўваюцца на Фестываль-конкурс.

4. Дырэктару ўстановы адукацыі (далей – УА) “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі” Екіменка С.В.:

4.1. адшукаць магчымасць заахвочвання педагагічных работнікаў, якія былі задзейнічаны ў арганізацыі і правядзенні Фестывалю-конкурсу;

4.2. забяспечыць падрыхтоўку і дастаўку ва УА “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” праектаў, якія ўзнагароджаны дыпломамі I і II ступені, да ўдзелу ў заключным этапе Фестывалю-конкурсу.

5. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Кавалёву А.Г.

Начальнік галоўнага
ўпраўлення адукацыі Р.І.Смірноў

Намеснік начальніка галоўнага
ўпраўлення адукацыі
А.Г.Кавалёва

Выконваючы абавязкі начальніка аддзела выхаваўчай і сацыяльнай работы галоўнага ўпраўлення адукацыі, намеснік начальніка аддзела
Н.В.Маркава

Маркава
Макушкін 8 0232 21 20 07